ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (1198) ● 30 сакавіка 1978 г. Цана 2 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КАЛЕКТЫВУ БДУ ● **ПРАЦЯГВАЕЦЦА СУПРАЦОЎНІЦТВА З ІЕНСКІМ УНІВЕРСІТЭТАМ** ● ГРАМАДСКАСЦЬ БДУ ПРАТЭСТУЕ СУПРАЦЬ ІЗРАІЛЬСКАЙ АГРЭСІІ НА БЛІЗКІМ УСХОДЗЕ ● **СЛОВА САВЕТУ ВЫДАТНІКАЎ** ● СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ: ВЫПУСК № 16 ● **РАСКАЗВАЕ ЧЛЕН ТУРЫСТЫЧНАГА КЛУБА БДУ** ● НА ЎСЁ ЁСЦЬ ЧАС: ФОТАЗАМАЛЁЎКА ● **УГЛЕДЗЬЦЕСЯ Ў СЛОВЫ...** ● 1 КРАСАВІКА—ДЗЕНЬ СМЕХУ: КАФЕДРА АГУЛЬНАГА СМЕХАРОБСТВА ЗАПРАШАЕ ЧЫТАЧОЎ НА ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК.

## Сацыялістычныя абавязацельствы

### КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1978 ГОД

Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна настойліва змагаецца за здзяйсненне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС. Вялікімі дасягненнямі ў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце азнаменаваны другі год дзесятай пяцігодкі — год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і прыняцця новай Канстытуцыі СССР. Паспяхова выкананы планавыя заданні і сацыялістычныя абавязацельствы 1977 года і за два гады пяцігодкі.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў, студэнты, аспіранты, рабочыя, служачыя універсітэта горача адабраюць рашэнні нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання, снежаньскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, якія выкладзены ў прамове на Пленуме Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышам Л. І. Брэжневым, прымаюць іх да няўхільнага кіраўніцтва і, адказваючы канкрэтнымі справамі на Пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне і перавыкананне плана 1978 года і ўзмацненні барацьбы за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы», прымаюць на 1978 год — трэці год дзесятай пяцігодкі наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Забяспечыць выкананне дзяржаўнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў, устаноўленага на 1978 год па ўсіх формах навучання. Дабіцца за кошт удасканалення ўсіх форм вучэбнай работы зніжэння адсеву студэнтаў па непаспяховасці на 4 працэнты ў параўнанні з 1977 годам.

2. Прадоўжыць работу па далейшаму паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і задавальненню патрэбнасцей народнай гаспадаркі ў спецыялістах з універсітэцкай адукацыяй. З гэтай мэтай:

— адкрыць новыя спецыялізацыі па мікраэлектроніцы, радыяцыйнаму металазнаўству, аўтаматызацыі навуковых даследаванняў на фізічным і радыёфізічным факультэтах;

— пастаянна ўдасканальваць вучэбную і навукова-метадычную дзейнасць, дабіцца павышэння тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню ўсіх відаў вучэбнай работы са студэнтамі, шырокага ўкаранення перадавога вопыту, які назапашан ВНУ краіны, рэспублікі, універсітэта;

— з мэтай абагульнення і распаўсюджання перадавога вопыту забяспечыць якаснае правядзенне на базе універсітэта 7 рэспубліканскіх і гарадскіх нарад-семінараў работнікаў ВНУ розных узроўняў;

— выдаць і падрыхтаваць да выдання не менш 260 вучэбна-метадычных дапаможнікаў і распрацовак; падрыхтаваць і заслухаць на кафедрах не менш 350 навукова-метадычных дакладаў;

— дабіцца паляпшэння псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, якім належыць працаваць у агульнаадукацыйнай школе; завяршыць карэкціроўку вучэбных планаў, у адпаведнасці з дазволам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, для педагагічных і вытворчых патокаў фізічнага, механіка-матэматычнага, хімічнага і біялагічнага факультэтаў; расшырыць і ўзмацніць сувязі адзначаных вышэй і іншых факультэтаў, якія рыхтуюць педагогаў, са школамі г. Мінска і рэспублікі ў святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 22 снежня 1977 года № 1111 аб удасканаленні работы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы;

— пастаянна весці работу па ўдасканальванню спецыялізацыі, аднаўленню спецкурсаў і спецсемінараў у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія вынікаюць з рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, снежаньскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, папаўненню іх самымі навейшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі; распрацаваць і ўдасканаліць не менш 160 спецкурсаў, 90 лабараторных работ;

— прадоўжыць работу па ўкараненню ў вучэбны працэс сучасных тэхнічных сродкаў навучання; актывізаваць дзейнасць семінара выкладчыкаў па методыцы выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання; падрыхтаваць не менш 700 серый дыяпазітываў па курсах, якія чытаюцца; абсталяваць на працягу года дадаткова поўным комплексам ТСН 2 паточныя аўдыторыі, 1 лінгафонны кабінет; перайсці ад вопытнай эксплуатацыі класаў электронна-вылічальнай навучаючай сістэмы (ЭВНС-БДУ) да пастаяннага выкарыстання яе ў навучанні кафедрамі фізічнага, радыёфізічнага, матэматычнага, прыкладной матэматыкі і хімічнага факультэтаў універсітэта; абсталяваць і ўвесці ў эксплуатацыю 2-гі клас ЭВНС-БДУ на 16 пультаў на базе міні-ЭВМ з прымяненнем тэлевізійнай тэхнікі;

— ахапіць навукова-даследчай работай не менш 76 працэнтаў студэнтаў дзённай формы навучання; прадставіць не менш 700 студэнцкіх навуковых работ высокай якасці на рэспубліканскі і ўсесаюзны агляды-конкурсы;

— правесці шырокую работу па прыцягненню абітурыентаў для паступлення ва універсітэт, забяспечыўшы патрэбны конкурс па ўсіх факультэтах і формах навучання і якаснае выкананне плана прыёму;

— дабіцца якаснага выканання плана прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне па ўсіх спецыяльнасцях; знізіць адсеў слухачоў аддзялення ў параўнанні з 1977 годам на 10 працэнтаў.

3. Павысіць эфектыўнасць і якасць фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у галіне грамадскіх, прыродазнаўчых і тэхнічных навук, удасканальваць формы сувязі навукі з вытворчасцю, паскорыць укараненне навуковых даследаванняў у народную гаспадарку, узмацніць зацікаўленасць навуковых калектываў і супрацоўнікаў у павышэнні рэзультатыўнасці іх дзейнасці. Забяспечыць выкананне на высокім узроўні запланаваных заданняў у галіне навуковых даследаванняў усімі кафедрамі, НДІ, лабараторыямі, кожным выкладчыкам да 20 снежня 1978 года.

У галіне навукова-даследчай работы:

— давесці ў 1978 годзе колькасць тэм, выконваемых па пастановах Савета Міністраў СССР і БССР, праграмах работ па рашэнню навукова-тэхнічных праблем і асобных пастановах Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы, каардынацыйных планах АН СССР і БССР, заказах галіновых міністэрстваў, ведамстваў і ВТА па Дзяржбюджэту да 50 працэнтаў ад агульнай колькасці тэм, па гасдагавору — да 37 працэнтаў; звярнуць асаблівую ўвагу на якасць выканання заказаў прамысловых прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў;

— выканаць устаноўлены план па дасягненню зацверджанага вытворчасцю эканамічнага эфекту ад укаранення вынікаў завершаных навуковых работ на 101 працэнт;

— падрыхтаваць і выдаць 35 манаграфій, 30 падручнікаў і дапаможнікаў, 15 брашур, 15 зборнікаў навуковых прац, апублікаваць не менш 1800 артыкулаў;

— аформіць і прадставіць у Дзяржаўны камітэт па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў не менш 135 заяў на мяркуемыя вынаходніцтвы і дабіцца атрымання не менш 54 станоўчых рашэнняў;

— падрыхтаваць і правесці 5 навукова-тэарэтычных канферэнцый і юбілейную навуковую сесію, прысвечаную 60-годдзю ўтварэння БССР і Кампартыі Беларусі;

— прыступіць да вопытнай вытворчасці універсальнай міні-ЭВМ, распрацаванай вучонымі універсітэта;

— дабіцца павелічэння каэфіцыенту загрузкі і ліквідацыі пpастояў навуковага і вучэбнага абсталявання; забяспечыць на месяц раней устаноўленага тэрміну трохзменную работу ЭВМ «ЕС-1022», выканаць план загрузкі ўсіх ЭВМ ВЦ БДУ. Дабіцца сярэднегадавога каэфіцыента карыснай работы ЭВМ «Мінск-32» — 0,92, ЭВМ «ЕС-1020»—0,83. Прадоўжыць распрацоўку і ўкараненне АСК БДУ; у 1978 годзе здаць у эксплуата-

**(Заканчэнне на 3-й стар.).**

## Супрацоўніцтва развіваецца

**З 13 па 16 сакавіка рэктарат БДУ імя У. І. Леніна прымаў дырэктара аддзела міжнародных сувязей Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера Х. Цітль. У час яго знаходжання ў БДУ падпісан план навуковага і культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі універсітэтамі на 1978—1980 гады. Адзначым, што супрацоўніцтва ў гэтыя гады атрымае далейшае развіццё — планам прадугледжваюцца сумесныя даследаванні фізікаў, хімікаў, гісторыкаў і філолагаў.**

**У плане прадугледжан абмен прафесарска - выкладчыцкім саставам для чытання лекцый, а таксама абмен чатырма групамі студэнтаў на азнаямленчую вытворчую практыку па спецыяльнасцях: матэматыка, фізіка, гісторыя, філалогія.**

**Акрамя таго, ВНУ будуць абменьвацца навуковай інфармацыяй, друкаванымі работамі, вопытам арганізацыі вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы.**

**Госць з ГДР азнаёміўся са славутасцямі горада-героя Мінска.**

**А. АМЯЛЬКОЎ,**
**начальнік аддзела замежных сувязей.**

## Рашучы пратэст

**На падрыхтоўчым факультэце БДУ адбыўся сход арабскіх студэнтаў, якія гнеўна асудзілі ізраільскую агрэсію супраць арабскіх народаў.**

**У заяве, якую прынялі студэнты, у прыватнасці адзначаецца, што ахвярамі ізраільскіх агрэсараў сталі тысячы мірных арабаў. Студэнты патрабавалі тэрмінова вывесці ізраільскія войскі з Лівана.**




## МІТЫНГ ПРАТЭСТУ

20 сакавіка на фізфаку адбыўся агульнафакультэцкі мітынг пратэсту студэнтаў супраць ізраільскай агрэсіі ў Ліване. На мітынгу выступілі сакратар камітэта камсамола факультэта Сяргей Баранаў, студэнты Наталля Кемброўская, Аляксандр Сядзяка, а таксама студэнт з Лівана Халед Бадаул.

Студэнцтва фізічнага факультэта гнеўна асудзіла агрэсію Ізраіля. На мітынгу была прынята рэзалюцыя.

**РЭЗАЛЮЦЫЯ МІТЫНГУ ПРАТЭСТУ СТУДЭНТАЎ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА СУПРАЦЬ ІЗРАІЛЬСКАЙ АГРЭСІІ У ЛІВАНЕ.**

Мы, студэнты фізічнага факультэта Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, як усе савецкія людзі, як уся сусветная грамадскасць, глыбока абураны ізраільскай агрэсіяй супраць Лівана.

Няма і не можа быць ніякага апраўдання гэтаму крываваму злачынству, бясчынствам і распраўам над мірнымі жыхарамі Лівана, ліванскімі нацыянальна-вызваленчымі сіламі, палесцінскімі бежанцамі.

Ізраільская агрэсія накіравана на зрыў палітычнага ўрэгулявання блізкаўсходняга канфлікту, падрыў нацыянальна-вызваленчай барацьбы арабскіх народаў і такім чынам у цэлым супярэчыць міралюбівым імкненням усіх прагрэсіўных колаў чалавецтва.

Мы патрабуем спынення ваенных дзеянняў супраць Лівана і неадкладнага вываду войск Ізраіля з яго тэрыторыі.

Далоў ізраільскіх агрэсараў!

Няхай жыве мір ва ўсім свеце!

# Увага здароўю

ЧЛЕНЫ групы народнага кантролю БДУ ў перыяд з 14 па 18 лютага 1978 года ў саставе старшага выкладчыка хімічнага факультэта Я. У. Герта, фельчара палiклінічнага аддзялення БДУ імя У. І. Леніна Л. Д. Дзьячэнкавай і выкладчыка падрыхтоўчага аддзялення Р. А. Міхневіч правялі праверку работы паліклінікі БДУ імя У. І. Леніна па наступных пытаннях:

1. Здзяйсненне кантролю за санітарна-гігіенічным станам інтэрнатаў, наяўнасць і камплектнасць аптэчак першай дапамогі на факультэтах, кафедрах і ў інтэрнатах.

2. Правядзенне і перыядычнасць прафілактычных аглядаў студэнтаў і супрацоўнікаў, а таксама мерапрыемстваў па прафілактыцы інфекцыйных захворванняў, санадукацыйнай рабоце і дыспансерызацыі студэнтаў з хранічнымі захворваннямі.

3. Здзяйсненне санітарнага кантролю за пунктамі грамадскага харчавання.

У выніку праверкі ўстаноўлена наступнае:

1. Работнікамі паліклінікі праводзіцца патрэбная работа па кантролю за санітарным станам студэнцкіх інтэрнатаў. Ёсць графік размеркавання ўрачоў і фельчараў па інтэрнатах у вучэбных карпусах і на факультэтах. У пачатку навучальнага года па ініцыятыве паліклінікі праводзіцца арганізацыйная праверка санітарнага стану ўсіх інтэрнатаў. Далей кантроль за санітарным станам інтэрнатаў здзяйсняецца не менш аднаго разу ў месяц. Аб адзначаных недахопах медыкі дакладваюць начальніку студгарадка. Вынікі наведванняў фіксуюцца ў спецыяльным журнале, азнаямленне з якім дазваляе зрабіць вывад аб прынцыповым і якасным кантролі. Так, напрыклад, пры аглядзе 30 верасня 1977 года інтэрната № 6 урач М. П. Яцэвіч зрабіла заключэнне, што інтэрнат не падрыхтаван да прыёму студэнтаў, якія вярталіся з сельгасработ. Гэта ў значнай ступені садзейнічала хуткаму правядзенню мерапрыемстваў па навядзенню парадку ў інтэрнаце. У запісе ад 30 снежня 1977 года М. П. Яцэвіч адзначае добры стан інтэрната № 6. Аналагічная сітуацыя мела месца ў інтэрнаце № 1, які кантралюе ўрач А. П. Цярохін. У перыяд эпідэміі грыпу ўрачом А. П. Цярохіным па ўласнай ініцыятыве праведзен агляд усіх інтэрнатаў. У мінулым годзе работнікі паліклінікі наведалі кожны інтэрнат 12—13 разоў.

У інтэрнатах на кожным паверсе размешчаны санітарныя пасты, у састаў якіх ўваходзяць студэнты, што праходзяць медыцынскую падрыхтоўку. Аптэчкі знаходзяцца на кантрольна-прапускным пункце, і адказнасць за іх нясе дзяжурны па інтэрнату. Праверка інтэрнатаў №№ 2, 5, 6, 7 паказала, што аптэчкі ў дастатковай меры ўкамплектаваны медыкаментамі першай неабходнасці (бінт, вата, настойка ёду, нашатырны спірт, марганцоўка). У перыяд эпідэміі грыпу аптэчкі папаўняліся тэрмометрамі, а ў шэраг інтэрнатаў былі дастаўлены вялікія аптэчкі. У інтэрнаце № 5, дзе пражываюць замежныя студэнты, у перыяд захворвання грыпам знаходзіўся дзяжурны ўрач, які прымаў хворых з 10 да 12 гадзін.

У інтэрнаце № 8 (Шчомысліцы) адсутнічае фельчарскі пункт. Камісія лічыць неабходным прасіць рэктарат БДУ хадайнічаць перад гарадскім аддзелам аховы здароўя аб адкрыцці ў гэтым інтэрнаце фельчарскага здраўпункта для абслугоўвання студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

Значна горш абстаіць справа з камплектнасцю аптэчак першай дапамогі ў лабараторыях прыродазнаўчых факультэтаў. Так, напрыклад, у большасці лабараторый хімічнага факультэта, дзе верагоднасць вытворчага траўматызму найбольш высокая, у аптэчках адсутнічаюць бінты, сода, нашатырны спірт. У той жа час паліклініка можа забяспечыць гэтымі медыкаментамі ўсе лабараторыі. Камісія лічыць мэтазгодным назначыць на кожнай кафедры санітарныя пасты, а адказнасць за непасрэдную камплектнасць аптэчак ускласці на асоб, адказных за тэхнічную і пажарную бяспеку. Яны змаглі б праз санітарныя пасты кафедр у арганізаваным парадку перыядычна папаўняць аптэчкі медыкаментамі першай неабходнасці.

2. Кожны ўрач паліклінікі замацаван за пэўным факультэтам і адказвае за ўсе запланаваныя мерапрыемствы: медыцынскі агляд, прывіўкі, дыспансерызацыю і г. д. Студэнты I, II, IV курсаў рэгулярна ў арганізаваным парадку праходзяць медыцынскі агляд. Студэнты радыёфізічнага і хімічнага факультэтаў, якія працуюць з асабліва шкоднымі рэчывамі, абследуюцца лабараторна ўсімі спецыялістамі. Супрацоўнікі гэтых факультэтаў у абавязковым парадку адзін раз у год праходзяць прафагляд, які праводзіць паліклініка БДУ сумесна з паліклінікай № 6.

Так, у 1977 годзе паліклінікай абследавана 98,8 працэнта студэнтаў IV курса. У гаспіталізацыі мелі патрэбу 28 чалавек, усе яны гаспіталізаваны; у санітарна-курортным лячэнні мелі патрэбу 187 чалавек, атрымалі пуцёўкі 166. У дыетычным харчаванні мелі патрэбу 35 чалавек, і ўсе яго атрымалі. Прафілактычнае лячэнне атрымалі 480 чалавек, г. зн. 98 працэнтаў хворых. Усяго ў 1977 годзе атрымалі пуцёўкі ў прафілакторый 750 студэнтаў, 104 студэнты — пуцёўкі ў дамы адпачынку. 74 студэнты праходзілі санітарна-курортнае лячэнне, а ў спартыўна-аздараўленчым лагеры адпачывала 750 чалавек. У справаздачным годзе ўрачамі праведзена 139 лекцый і кароткіх урачэбных выступленняў, сярэднім медыцынскім персаналам праведзена 368 гутарак. Выпушчана 29 санбюлетэняў і аформлена 27 санвітрын.

Камісія адзначае добрую работу паліклінікі па данаму пытанню.

3. За кожнай сталовай і буфетам паліклінікай замацаван урач. Санітарны стан аб'ектаў харчавання ў 1977 годзе значна палепшыўся. Патрэбна адзначыць, што ніводнага разу не закрывалі ні адну сталовую, не было складзена ніводнага акта. Гэта добра ў параўнанні з 1975—76 гг., калі неаднаразова для навядзення парадку закрывалася сталовая хімічнага факультэта і на яе накладвалі штрафы. Стан аб'ектаў грамадскага харчавання БДУ імя У. І. Леніна значна палепшыўся пасля рамонту базавай сталовай па вул. Кастрычніцкай.

Камісія рэкамендуе:

1. Прасіць рэктарат БДУ імя У. І. Леніна звярнуцца з хадайніцтвам у гарадскі аддзел аховы здароўя аб адкрыцці ў інтэрнаце № 8 (у Шчомысліцы) фельчарскага здраўпункта для абслугоўвання студэнтаў і супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта.

2. Аддзелу аховы працы перыядычна правяраць наяўнасць і камплектнасць аптэчак першай дапамогі ў лабараторыях і на факультэтах.

**М. КНІГА,**
**загадчыца сектара быту ГНК БДУ.**

# Справаздачы ў органах народнага кантролю

У сувязі з тым, што Закон аб народным кантролі будзе прынят толькі ў канцы гэтага года, у групах народнага кантролю не праводзіцца справаздачна-выбарная кампанія, хаця ў красавіку — маі 1978 года мінае двухгадовы тэрмін дзейнасці ГНК цяперашняга саставу (прызнана мэтазгодным правесці справаздачы і выбары пасля прыняцця ўказанага Закона, у адпаведнасці з ім). Таму ў групах народнага кантролю зараз праводзяцца толькі справаздачы аб праробленым за мінулы тэрмін. У адпаведнасці з рашэннямі вышэйстаячых органаў народнага кантролю бюро ГНК БДУ дало ўказанне ўсім групам народнага кантролю факультэтаў і іншых падраздзяленняў універсітэта правесці да 5 красавіка г. г. сходы або канферэнцыі, на якіх неабходна абмеркаваць справаздачы аб рабоце груп за перыяд з красавіка 1976 года і намеціць мерапрыемствы па паляпшэнню дзейнасці народных кантралёраў. Папярэдне прапанавана абмеркаваць на сходах ГНК перадавы артыкул газеты «Праўда» ад 28 снежня 1977 года «У масавасці — моц народнага кантролю» і прыняць меры да выканання рэкамендацый па прыцягненню ўсіх народных кантралёраў да актыўнай работы па выяўленню і ліквідаванню маючыхся недахопаў, да правядзення масавых комплексных праверак, рэйдаў, аглядаў па павышэнню эфектыўнасці праверак і рэкамендацый ГНК, узмацненню галоснасці ў іх рабоце і да т. п.

Пасля правядзення справаздачных сходаў або канферэнцый на факультэтах і ў іншых падраздзяленнях і выбрання адпаведнай колькасці дэлегатаў 6 красавіка адбудзецца універсітэцкая справаздачная канферэнцыя груп народнага кантролю, на якой будзе заслухана і абмеркавана справаздача бюро ГНК БДУ аб прарobленым за двухгадовы перыяд.

Правядзенне справаздачных сходаў (канферэнцый) — важнае мерапрыемства ў дзейнасці груп народнага кантролю універсітэта. Яно павінна быць чарговай вяхой у паляпшэнні работы гэтых груп. Таму неабходна забяспечыць такі ўзровень правядзення сходаў (канферэнцый), які садзейнічаў бы выкананню гэтай задачы. На сходах павінны быць крытыка і самакрытыка, выяўленне нявыкарыстаных магчымасцей па актывізацыі дзейнасці народных кантралёраў, павышэнню эфектыўнасці праверак і прынятых па іх рэкамендацый, а таксама абмеркаванне шляхоў далейшага ўмацавання кантактаў груп народнага кантролю з грамадскімі арганізацыямі, пастаяннага інфармавання калектыву працоўных аб праведзеных праверках і прынятых па іх мерах.

Хаця перавыбары груп народнага кантролю не праводзяцца, у адпаведнасці з арт. II дзейнічаючага Палажэння аб органах народнага кантролю СССР «сход або канферэнцыя прадстаўнікоў калектыву працоўных па сваёй ініцыятыве або па прапанове групы, паста народнага кантролю могуць датэрмінова адклікаць члена групы, паста, калі ён не апраўдаў аказанага яму давер'я. Замест адкліканых або выбыўшых з БДУ членаў групы народнага кантролю на сходзе або канферэнцыі прадстаўнікоў калектыву могуць быць давыбраны, калі ў гэтым ёсць неабходнасць, новыя члены з ліку перадавых, найбольш актыўных і аўтарытэтных супрацоўнікаў і студэнтаў, выкладчыкаў, аспірантаў. Да вырашэння гэтага пытання належыць падыходзіць даволі ўдумліва, не допускаючы паспешлівых, непрадуманых вывадаў у адносінах да таго або іншага кантралёра. Калі чалавек не апраўдаў аказанага яму давер'я па прычыне свайго нежадання працаваць, калі ён безадказна адносіцца да выканання грамадскага даручэння, мэтазгодна ставіць пытанне аб адказнасці такога нядбайнага таварыша перад адпаведным калектывам, партыйнай, прафсаюзнай або камсамольскай арганізацыяй. Разам з тым на сходах (канферэнцыях) трэба ў той або іншай форме адзначаць добрую працу тых народных кантралёраў, якія актыўна выконвалі ўсе ўскладзеныя на іх абавязкі, працавалі, як гаворыцца, з душой, з агеньчыкам. А такіх таварышаў у нас нямала. Так, напрыклад, шмат добрых слоў можна сказаць аб Л. Р. Кірыле, А. Д. Андрэеве, М. В. Кнізе, А. А. Акінчыц, М. Ф. Казалёве, Р. А. Міхневіч, Л. К. Пясткоўскай, А. У. Баркове, У. М. Хомічу, М. А. Сакалове, Я. І. Тарасевіч, В. П. Яноўскім, Д. М. Каруліне, Г. І. Васільевай, М. Я. Ігнаценка, В. В. Левым, Я. В. Нянашаве, М. Н. Альхоўка, А. В. Байкове, Я. П. Клопаве і многіх іншых.

**І. ЦІШКЕВІЧ,**
**намеснік сакратара парткома, старшыня ГНК БДУ.**



## СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

*ВЫПУСК № 16*

# ДЗЕЙСНАСЦЬ

**(З ВОПЫТУ РАБОТЫ ГРУПЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ СКТБ З ВВ ПРЫ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА)**

Група народнага кантролю СКТБ з ВВ пачала сваю работу з мая 1976 года. У яе ўвайшло 19 чалавек.

На агульным сходзе членаў групы было выбрана бюро ў саставе 8 чалавек. У бюро групы ўвайшлі: старшыня, намеснік старшыні, сакратар і кіраўнікі сектараў.

У адпаведнасці са спецыфікай работы СКТБ з ВВ было створана 5 сектараў:

1. Сектар арганізацыйнай работы, галоснасці і кантролю за разглядам пісьмаў, скаргаў і заяў.

2. Сектар па кантролю за скарачэннем страт рабочага часу і ўдасканаленнем арганізацыі вытворчасці і працы.

3. Сектар па кантролю за захаваннем сацыялістычнай уласнасці і рэжыму эканоміі.

4. Сектар па кантролю за выкананнем вытворчых планаў, выяўленню і выкарыстанню рэзерваў вытворчасці.

5. Сектар па кантролю за якасцю выпускаемай прадукцыі.

Адразу ж быў складзен план работы групы на другое паўгоддзе 1976 года, адпаведна з якім праведзена 9 праверак.

Неабходна адзначыць, што ў рабоце групы ў 1976 годзе меліся недахопы. Праверак праводзілася шмат, але рэзультатыўнасць іх была невысокай. Перашкаджала адсутнасць вопыту ў рабоце.

У студзені 1977 года на адкрытым партыйным сходзе была зроблена справаздача аб рабоце групы за 1976 год. Сход выявіў недахопы і намеціў мерапрыемствы па паляпшэнню работы групы.

Пасля партыйнага сходу члены групы вывучылі пастанову ЦК КПСС «аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР». Гэта пастанова стала праграмай дзеянняў групы народнага кантролю.

Планы работы групы ўдакладняюцца на партыйным бюро, а затым зацвярджаюцца на сходзе членаў групы. У планы работы ўключаюцца найбольш актуальныя пытанні, якія патрабуюць праверкі. Палепшыліся якасць і дзейснасць праверак.

Вынікі праверак разглядаюцца на пасяджэннях бюро групы ў прысутнасці зацікаўленых асоб, прымаюцца пастановы з рэкамендацыямі, пасля чаго ўсе матэрыялы прадстаўляюцца кіраўнікам для прыняцця адпаведных мер. Як правіла, па выніках кожнай праверкі выдаецца загад па СКБТ з ВВ, устанаўліваюцца тэрміны і адказныя па ліквідаванню выяўленых недахопаў і выкананню рэкамендацый групы.

Пасля заканчэння ўстаноўленых тэрмінаў праводзяцца паўторныя праверкі. Правяраемыя пытанні не здымаюцца з парадку дня да той пары, пакуль не будуць ліквідаваны выяўленыя недахопы і не будзе палепшана справа.

Вялікая ўвага ўдзяляецца галоснасці. На стэндзе ГНК сістэматычна вывешваецца інфармацыя аб выніках праверак і прынятых мерах.

У выніку актыўнай работы групы народнага кантролю ў СКТБ з ВВ палепшылася становішча спраў з матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем, якасцю выпускаемай прадукцыі, эканоміяй металаў і захаванасцю матэрыяльных каштоўнасцей, з работай сталовай і ў шэрагу іншых пытанняў.

**М. ІГНАЦЕНКА,**
**старшыня групы народнага кантролю СКТБ з ВВ.**

# Сацыялістычныя абавязацельствы

## КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1978 ГОД

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

цыю падсістэму «Кадры супрацоўнікаў» і правесці вопытную эксплуатацыю падсістэмы «Кадры аспірантаў».

4. Удасканальваць падрыхтоўку і атэстацыю навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру, інстытуты і факультэты павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў. З гэтай мэтай:

— падрыхтаваць і прадставіць да абароны не менш 10 доктарскіх дысертацый;

— шляхам конкурснага адбору забяспечыць выкананне дзяржаўнага плана прыёму ў аспірантуру за лік добра падрыхтаваных, здольных да навукова-даследчай і педагагічнай работы асоб, якія добра валодаюць методыкай навуковых даследаванняў; дабіцца, каб не менш 65 працэнтаў аспірантаў закончылі аспірантуру, абараніўшы дысертацыю або прадставіўшы работу да абароны; аспірантам, спаборнікам на атрыманне, і супрацоўнікам абараніць або прадставіць да абароны на працягу года не менш 50 кандыдацкіх дысертацый;

— шляхам удасканалення атэстацыі, конкурснага адбору і сістэмы павышэння кваліфікацыі дабіцца значнага якаснага паляпшэння навукова-педагагічных кадраў, удасканалення іх спецыяльных ведаў і педагагічнага майстэрства; павялічыць колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў з вучонымі ступенямі і званнямі на 1 працэнт, ахапіць усімі формамі павышэння кваліфікацыі не менш 20 працэнтаў выкладчыкаў; кафедрам і дэканатам забяспечыць паляпшэнне якаснага боку справы павышэння кваліфікацыі, шырокае распаўсюджанне і ўкараненне ў практыку работы атрыманых ведаў;

— дабіцца далейшага ўдасканалення работы ІПК і ФПК пры Белдзяржуніверсітэце; забяспечыць павышэнне якасці выкладання ў ІПК шляхам прыцягнення вядучых грамадазнаўцаў г. Мінска, вядомых партыйных і дзяржаўных работнікаў для работы са слухачамі, запрашэння найбольш вядомых спецыялістаў з Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў; на ФПК перагледзець састаў лектараў, прыцягнуць высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне фізіка-матэматычных навук; забяспечыць выкананне ўстаноўленага плана прыёму і выпуску слухачоў па ІПК і ФПК.

5. З мэтай пастаяннага ўдасканалення работы па камуністычнаму выхаванню студэнтаў і ўсяго калектыву:

— забяспечыць далейшае укараненне распрацаванай з улікам патрабаванняў XXV з'езда КПСС і зацверджанай парткомам і рэктаратам комплекснай праграмы і плана ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на 5-гадовы перыяд навучання ва універсітэце;

— у адпаведнасці з распрацаваным і зацверджаным парткомам і саветам універсітэта новым «Палажэннем аб грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў у Белдзяржуніверсітэце» актывізаваць усе формы ГПП;

— забяспечыць расшырэнне і далейшае паляпшэнне работы школы маладога лектара і факультэта грамадскіх прафесій; павялічыць колькасць слухачоў школы маладога лектара на 12 працэнтаў і факультэта грамадскіх прафесій на 17 працэнтаў у параўнанні з 1977 годам;

— павысіць грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў у падшэфных домакіраўніцтвах, школах, ГПТВ г. Мінска, калгасах і саўгасах Дзяржынскага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага, Уздзенскага і Клецкага раёнаў; арганізаваць не менш 20 выездаў лекцыйна-агітацыйных брыгад і калектываў мастацкай самадзейнасці ў падшэфныя арганізацыі; прадоўжыць работу шасці «школ юных» для вучняў гарадскіх і сельскіх падшэфных школ, накіраваць 15 педатрадаў студэнтаў для работы ў піянерскіх пакоях пры домакіраўніцтве;

— усяму калектыву універсітэта прадоўжыць актыўную работу па прапагандзе рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, новай Канстытуцыі СССР, матэрыялаў снежаньскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, па растлумачэнню Пісьма ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве; сіламі калектыву БДУ прачытаць для насельніцтва рэспублікі не менш 7,2 тыс. лекцый і дакладаў на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы;

— сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад агульнай колькасцю 1800 чалавек для работы ў летні час і адзін колькасцю 65 чалавек для работы ў зімовы час; забяспечыць асваенне студэнцкімі будаўнічымі атрадамі не менш 5 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў;

— у ходзе падрыхтоўкі да 60-годдзя ВЛКСМ і 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі расшырыць і ўдасканаліць формы патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнтаў.

6. Забяспечыць датэрміновае выкананне планаў усімі гасразліковымі прадпрыемствамі Белдзяржуніверсітэта. Па выдавецтву і друкарні БДУ выканаць гадавы план да 25 снежня; па спецыяльнаму канструктарскаму бюро з ВВ—да 28 снежня; па вучэбна-вопытнай гаспадарцы «Шчомысліца» выканаць вытворчы план да 15 лістапада, атрымаць прыбытак 72 тыс. рублёў.

7. Дабіцца выканання планаў капітальнага будаўніцтва, праектна-разведвальных работ і мерапрыемстваў па развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы. У галіне развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта ў 1978 годзе забяспечыць:

— разгляд на Саўміне БССР і ў Дзяржплане СССР скарэкціраванага ТЭА і генплана універсітэцкага комплексу на новай пляцоўцы, а таксама плана будаўніцтва першай чаргі; рашэнне ўсіх пытанняў, якія звязаны з далявым удзелам універсітэта ў будаўніцтве пазапляцовачных інжынерных сетак;

— увод у эксплуатацыю корпуса прыродазнаўчых (матэматычных) факультэтаў на новай пляцоўцы, як гэта прадугледжана народнагаспадарчым планам, у снежні 1978 г.;

— распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі да 1 жніўня 1978 года па першай чарзе СКТБ і першай чарзе вучэбна-лабараторнага корпуса біялагічнага факультэта;

— поўнае асваенне капітальных укладанняў, выдзеленых для пачатку будаўніцтва 118-кватэрнага жылога дома для прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта;

— выкананне плана па капітальнаму і сярэдняму рамонту аб'ектаў універсітэта да 20 снежня 1978 года;

— будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю другой чаргі біялагічнай станцыі БДУ ў раёне Вілейскага вадасховішча за кошт фонду рэктара.

8. Пастаянна змагацца за высокую працоўную і вучэбную дысцыпліну ў калектывах факультэтаў і падраздзяленняў універсітэта; весці непрымірымую барацьбу з парушальнікамі правілаў паводзін на рабоце, у грамадстве і быце; дабіцца зніжэння выпадкаў парушэння дысцыпліны і грамадскага парадку членамі калектыву універсітэта.

9. Пастаянна весці работу па паляпшэнню аховы працы і тэхнікі бяспекі; асвоіць 8 тыс. рублёў на мерапрыемствы па далейшаму ўдасканаленню ўмоў працы.

10. Настойліва дабівацца беражлівых адносін да дзяржаўнай маёмасці, эканомнага расходавання сродкаў і матэрыялаў; дабіцца ў 1978 годзе эканоміі:

— электраэнергіі—20 тыс. квт/ч;
— вады — 12 тыс. $м^3$;
— бензіну — 5 тыс. літраў;
— будматэрыялаў — на суму 20 тыс. рублёў. Давесці прабег аўтамашын без капітальнага рамонту да 170 тыс. км.

11. Замацаваць і развіць далей дасягнутыя вынікі ў спартыўнай і аздараўленчай рабоце. Правесці агульнауніверсітэцкую студэнцкую спартакіяду па 26 відах спорту і спартакіяду «Здароўе» па 12 відах спорту. Падрыхтаваць 5 майстроў спорту, 85 кандыдатаў у майстры спорту і спартсменаў I разраду, 3900 спартсменаў масавых разрадаў, 1200 інструктараў па фізкультуры і спорту, 1200 спартыўных суддзяў. Давесці колькасць студэнтаў і супрацоўнікаў, якія поўнасцю здалі нарматыў комплексу ГПА, да 70 працэнтаў. Ахапіць адпачынкам у летнім спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач» да 750 студэнтаў і 100 сем'яў супрацоўнікаў універсітэта.

12. З мэтай самага шырокага ўцягнення ўсіх студэнтаў, супрацоўнікаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу ў барацьбу за паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, усёй вучэбнай, навукова-даследчай і выхаваўчай работы ў калектыве, арганізаваць і правесці ў 1978 годзе агульнауніверсітэцкія агляды-конкурсы:

— на лепшую студэнцкую акадэмічную групу;

— на лепшую кафедру і навукова-даследчае падраздзяленне па культуры вытворчасці і ахове працы;

— на лепшую пастаноўку работы ў студэнцкім інтэрнаце. Правесці агляды мастацкай самадзейнасці, насценнага друку, нагляднай агітацыі.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна заклікае калектывы ВНУ г. Мінска і рэспублікі, а таксама выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя Капсукаса прадоўжыць сацыялістычнае спаборніцтва за павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і эфектыўнасці навуковых даследаванняў і дабіцца ў трэцім годзе пяцігодкі новых працоўных поспехаў.

Абавязацельствы абмеркаваны і прыняты на сходах калектываў факультэтаў, кафедр, навуковых і іншых падраздзяленняў універсітэта і адобраны партыйна-прафсаюзным і камсамольскім актывам.



Напярэдадні свайго дваццацігоддзя вылічальны цэнтр БДУ упершыню правёў конкурс на званне «Лепшы аператар ЭВМ». Падрыхтоўку і правядзенне конкурса ажыццявілі: вытворчы сектар камсамольскага бюро і вытворча-масавая камісія прафбюро ВЦ.

Мэтай конкурсу было выяўленне лепшых аператараў ЭВМ, развіццё творчай актыўнасці маладых супрацоўнікаў. Работа аператара ацэньвалася па наступных крытэрыях: уменне хутка і якасна выканаць канкрэтнае заданне; аб'ём і глыбіня ведаў, тэарэтычных і тэхнічных асноў сваёй работы. Конкурс складаўся з двух этапаў: практычнага і тэарэтычнага. На працягу дня былі выяўлены лепшыя з лепшых. Імі з'явіліся аператары: Н. Фядотава (верхні здымак), Л. Баркоўская, Р. Палтаржыцкая, Б. Струк.

Фота У. Носава.



Слова савету выдатнікаў

# НЯВЫКАРЫСТАНЫЯ РЭЗЕРВЫ

«Будучае належыць вам, маладыя будаўнікі камунізму!..» —гаварыў на XVII з'ездзе ВЛКСМ Л. І. Брэжнеў.

Маладыя будаўнікі камунізму — у гэтых словах і дакладны рытм БАМа, і размераны працоўны дзень рабочага, і напружанае жыццё студэнта.

Але «...нічога не прыходзіць само...» — гэтым вызначаецца магутны подых дзесятай пяцігодкі, у працоўных буднях якой штодзённа, штогадзінна нараджаюцца свае героі — ударнікі працы, выдатнікі вучобы, перадавікі вытворчасці...

Выдатнік вучобы — гэта не проста студэнт, які выдатна паспявае па ўсіх прадметах вучэбнай праграмы. Гэта — грамадскі дзеяч, актывіст, добры таварыш; ён павінен захапіць іншых, дапамагчы тым, каму патрэбна дапамога. Тым, што ты зрабіў для калектыву, у якім жывеш, і вызначаецца твая карыснасць факультэту, грамадству, краіне.

На гэта ў канчатковым выніку і накіравана работа нашага сектара па рабоце з выдатнікамі. З часу свайго ўзнікнення сектар праводзіў работу па трох асноўных напрамках: распаўсюджанне вопыту выдатнікаў, кантроль за грамадскай работай выдатнікаў, дапамога студэнтам малодшых курсаў. Асноўная форма работы сектара — лекцыі студэнтам малодшых курсаў, арганізацыя і кантроль за работай кансультацыйных пунктаў, распаўсюджанне вопыту выдатнікаў шляхам выступлення ў насценным друку і перад аўдыторыяй.

У ходзе праверкі выявілася, што ў нас кожны выдатнік-старшакурснік — актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця факультэта: з 22 выдатнікаў III—V курсаў няма ніводнага, хто б не меў грамадскай нагрузкі. Амаль кожны з іх уваходзіць або ў састаў камітэта камсамола факультэта, або ў бюро кафедры, або ў бюро групы...

Першакурснікі — навічкі ў нашым калектыве, многае для іх здаецца цяжкім, незвычайным, незразумелым. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб дапамагчы ім хутчэй уключыцца ў вучобу і грамадскую работу. З гэтай мэтай на I курсе на працягу семестра старшакурснікамі-выдатнікамі быў прачытан шэраг лекцый, у якіх яны расказалі аб арганізацыі свайго рабочага і вольнага часу, падзяліліся метадамі работы, далі парады па рабоце з вучэбным матэрыялам.

У ходзе зімовай сесіі выявілася, што самая нізкая паспяховасць у нас на малодшых курсах. Такім чынам, работа, якая праводзілася на факультэтах, недастатковая. На наш погляд, трэба ўзмацніць выхаваўчую работу на I і II курсах, а таксама палепшыць там работу кансультацыйных пунктаў, павысіць яе эфектыўнасць.

Вялікую дапамогу ў рабоце нам аказвае савет выдатнікаў камітэта камсамола універсітэта. Па яго рэкамендацыі ў нас прыменены такія метады заахвочвання выдатнікаў, як пісьмы падзякі ў школы, дзе яны вучыліся. Многія выдатнікі факультэта атрымалі права запісацца ў бібліятэку АН БССР. Вялікую дапамогу ў арганізацыі нашай работы аказвае таксама абмеркаванне работы факультэцкіх сектараў на пасяджэннях савета выдатнікаў.

Такім чынам, аналіз паказаў, што не ўсё яшчэ добра, ёсць недапрацоўкі, ёсць яшчэ ў нашай рабоце нявыкарыстаныя рэзервы, над выяўленнем якіх мы павінны працаваць у бягучым семестры.

**Л. БАРЫСЕВІЧ,**
**старшыня савета выдатнікаў факультэта радыёфізікі і электронікі.**

# КЛІЧУЦЬ НЯХОДЖАНЫЯ СЦЕЖКІ

Са студэнтам трэцяга курса факультэта радыёфізікі Дзімам Хайкіным мы размаўлялі аб справах турклуба.

— Больш пятнаццаці студэнтаў нашага факультэта з'яўляюцца членамі турклуба БДУ. Не так ужо шмат, але гэта надзвычай цікавыя людзі, — расказаў Дзіма.

Турыст! Назва гэта здабываецца і сцвярджаецца не толькі тэарэтычнымі пазнаннямі, не толькі фізічнай вытрымкай, прадэманстраванай у паходзе, хаця ў багажы сапраўднага турыста, несумненна, павінны быць і гэтыя якасці. Узаемаадносіны з калектывам, з атрадам — вось ад чаго трэба адштурхвацца, калі захочаце даведацца аб тым, якім павінен быць «чалавек з рукзаком».

А колькі іх крочыць па нашай краіне! Што ім расказваюць воды буйных рэк? Аб чым сакрэтнічаюць горы? Чым прыцягваюць рабят малаабходжаныя дарогі і сцяжынкі?

Для іх паходы — гэта сродак пазнання жыцця. Яны адкрываюць яго таінствы і хараство ў байдарках, пешшу з рукзаком за плячыма, у лыжных паходах і седзячы ля кастра.

Хто яны, гэтыя рамантыкі?

Дзіма расказвае аб сваіх таварышах па клубу:

— У маі 1977 года студэнт нашага факультэта Валодзя Масткоў узначальваў водны паход на байдарках. Маршрут праходзіў па мяжы Беларусі і Латвіі. Коля Барджэеў са сваім атрадам цяпер у Хібінах. Ён арганізаваў лыжны паход трэцяй катэгорыі складанасці. Коля — адзін з энтузіястаў турызму. На зімовых канікулах я хадзіў разам з атрадам, які ён узначальваў, у паход першай катэгорыі складанасці — у Карэлію. У паходах мы не толькі выконваем шэраг складаных пераходаў, не толькі правяраем сваю вытрымку, але і больш пазнаём сваю Радзіму. Мы наведалі Кіжы, дзе сабраны помнікі драўлянага дойлідства. Бачылі вадапад Ківач і... вясёлку зімой.

Незвычайнае становіцца блізкім, знаёмыя рабяты, якія былі вакол цябе кожны дзень на занятках, на трэніроўцы, у клубе, у паходах раптам адкрываюцца з новых, цікавых бакоў, выхоўваюць у сабе і ў цябе новыя, лепшыя якасці, выхоўваюць пачуцці дружбы, калектывізму, узаемадапамогі.

Магчыма, для гэтага і варта ісці па крутых турысцкіх сцежках...

Запісала Н. ЯКІМАВА.

# УГЛЕДЗЬЦЕСЯ Ў СЛОВЫ...

— Люда, хто твая гераіня?

— Бабуля.

— Звычайная старая бабуля?

— Не, зусім не звычайная. Яна жывая, вясёлая. Такая бабуля і маладым ні ў чым не ўступіць.

— Вось бачыш, ты ж разумееш характар цвятаеўскай гераіні, а чытаеш неяк вяла, сумна, — Дзіна Георгіеўна Тыцюк, кіраўнік студыі мастацкага слова, якая створана пры клубе БДУ, падыходзіць да кафедры.

— Паспрабуй перадаць свае адносіны да гэтага вобраза. Не бойся жэстаў! — даносіцца звонкі голас з глыбіні аўдыторыі.

— І дышы раўней, — гэта ўжо зусім побач.

Падказваць на занятках студыі дазваляецца, спрачацца таксама. Можна нават спазніцца і, скінуўшы паліто, рынуцца ў гушчу спрэчкі. Тут няма «старычкоў» і «навічкоў», таму што студыя існуе болей года і кожны памятае самыя першыя заняткі, калі ўсё пачыналася.

...У праўленні клуба вісела напружаная цішыня. «І чым тут займаюцца?» — падумаў нехта, беражліва вымаючы з сумкі томік вершаў. Проста чытаць — нецікава. Ды і кіраўнік нейкі малады, несалідны...

А «несалідны кіраўнік», быццам пачуўшы гэтыя думкі, раптам усміхнулася і спытала:

— Байку «Воўк і ягня» ўсе памятаеце?

«Ну, вось, байкі», — пранеслася ў галаве, напэўна, не ў аднаго новага студыйца.

— Давайце зробім ягня гэткім юным нахабнікам, які грубіяніць старэйшым, а воўк будзе старым, умудроным жыццёвым вопытам (ох, ужо гэта моладзь!). Ну, хто паспрабуе?

У рабят бліснулі вочы: «Цікава!»

Калі заняткі скончыліся, Дзіна Георгіеўна падумала: «А ці прыйдуць заўтра?» Старшынёй праўлення студэнцкага клуба яна стала пасля заканчэння тэатральнага аддзялення Ленінградскай вышэйшай прафсаюзнай школы культуры. Адразу ж вырашыла ўзяцца за здзяйсненне сваёй мары — арганізаваць студыю мастацкага слова. Дакладна прадумала план першых заняткаў. Здаецца, прайшло паспяхова. І ўсё-такі...

«Ці прыйдуць?»

...Прыйшлі. Прыходзяць і цяпер. Фізікі і лірыкі: Алёша Шаранкоў, Света Альшэўская, Саша Мятліцкі, Сяргей Мацкевіч, Наташа Якімава. Калі пасля заняткаў «шуміць» галава і скачуць непраставленыя ў кантрольным дыктанце коскі, прыходзяць яны сюды, як у дом лепшага сябра. З зайздрасцю праглядзяць прынесены кімсьці зборнік вершаў Еўтушэнкі, паспрачаюцца аб учарашнім літаратурным вечары.

Потым кароткая размінка з практыкаваннямі на дыкцыю, на ўвагу, і...

— Стоп! Усе на пляцоўку. Іграем эцюд «У цырку». Кожны выбірае сабе жанр цыркавога мастацтва. Праз пяць хвілін — прадстаўленне.

Замітусіліся, расстаўляючы крэслы, зашапталіся, заўсміхаліся ў прадчуванні творчай удачы. Зараз яны сапраўды здзіўляюча падобны на цыркавы калектыў, дружны і спаяны.

Калектыў... Ніхто, мабыць, не будзе аспрэчваць тое, што праблема пошуку новых форм зносін — адна з галоўных праблем студэнцтва. Маладзёжныя кафэ, дыскатэкі, «капуснікі». А вось гэтых рабят з'яднала паэзія. Тут яны вучацца не проста дэкламаваць вершы, вучацца разумець думкі і пачуцці аўтара. Разам з дыпломам гэтыя будучыя фізікі, матэматыкі, настаўнікі, журналісты атрымаюць пасведчанне аб заканчэнні факультэта грамадскіх прафесій і змогуць недзе далёка ад Мінска вось гэтак жа збіраць аднадумцаў, каб адкрываць для іншых цудоўны свет паэзіі, як адкрываюць яны яго зараз для сябе.

Захоплена гараць вочы, галасы — з хрыпатой ад спрэчак...

— Божа! Колькі можна, — у дзвярах аўдыторыі грозна ўзвышаецца вахцёр. — Усе нармальныя людзі спяць даўно, а гэтыя...

Засмучана ўздыхнуўшы і сабраўшы ў стос томікі вершаў, «ненармальныя» выйшлі з аўдыторыі. Крочачы па вячэрніх вуліцах, яны яшчэ громка абмяркоўваюць нейкі верш...

А ва універсітэцкім гарадку гаснуць ліхтары.

Т. ГУЦАВА,
студэнтка журфака.



# НА ЎСЁ ЁСЦЬ ЧАС

Праблема кожнага студэнта — час. Часу заўсёды не хапае. Але студэнт І курса гістарычнага факультэта Андрэй Гарбацкі ўмее размеркаваць яго так, каб спалучаць выдатную вучобу з вялікай грамадскай дзейнасцю.

Работа ў камітэце камсамола факультэта, трэніроўкі ў саставе зборнай каманды па валейболу, заняткі па фотаспраўе на факультэце грамадскіх прафесій — такое кола спраў і інтарэсаў Гарбацкага.

— Ты, Андрэй, не спіш, мабыць... — жартуюць аднакурснікі. Хлопец усміхаецца, ён спяшаецца ў інтэрнат. Сёння — пасяджэнне студсавета. А вечарам чакае праца над навуковай работай «Камсамольскія арганізацыі і прафтэхадукацыя г. Мінска».

А. БАТРАСАВА.

НА ЗДЫМКУ: А. ГАРБАЦКІ на занятках фатаграфіяй.

Фота аўтара.




# Мимоходом

✲ ЧУВСТВО ЮМОРА

С прискорбием сообщаем, что число умирающих от смеха приближается к нулю.

Люди делятся на два вида: те, с которыми шутки плохи, и те, у которых шутки плохи.

Слава богу, что в каждой шутке есть только доля правды!

✲ КОММУНИКАБЕЛЬНОСТЬ

Хорошая традиция сложилась в нашем НИИ. Пять дней в неделю сотрудники встречаются в половине девятого, делятся впечатлениями, пьют пиво, обмениваются мнениями, обедают вместе и в начале шестого расходятся по домам.

✲ ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

...каждая невыкуренная сигарета продлевает рабочий день на 12 минут.

✲ СОВЕТЫ ВРАЧА

Не засиживайтесь на одном месте.

✲ ЗАМЕТКИ ФИЛОЛОГА

«Сон» и «слон». Всего лишь на одну букву больше во втором слове, но — какая разница! «Дихлордифенилтрихлорметилметан» и «дуст». В первом слове на 26 букв больше, чем во втором, а разницы — никакой!

✲ ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

...на некоторых иностранных языках слово «сантехник» произносится как «сан-техник», где «сан» означает «святой».

# СТУДЕНЧЕСКИЕ ПОГОВОРКИ

Не вой, когда декан наступит на твой «хвост».

* * *

Думать не вредно не только на экзаменах.

* * *

Студентов по весне считают.

* * *

В карман не засунешь того, что помещается в чужой голове.

* * *

Не спи на лекциях — проспишь звонок.

* * *

Иные студенты подобны ящерице — потеряв «хвост», обретают новый.

* * *

Чего не понял на лекции — узнаешь на экзаменах.

* * *

Он ловил себя на хороших мыслях, но не мог поймать.

* * *

Раскинь мозгами, сказали студенту перед зачетом.

* * *

Он раскинул. До сих пор собрать не может.

* * *

Он жаловался на двойную нагрузку. Каждый предмет сдавал дважды.

Не всякий поступающий в вуз поступает правильно.

* * *

Последняя ночь перед экзаменом — попытка взять реванш за беспечно прожитый семестр.

* * *

Подсказка — пришедшая вслух студенту мысль.

* * *

Заповеди экзаменующегося: думай кратко, отвечай долго, в глаза смотри с пониманием, возражай тихо.

* * *

Белка в колесе — студент в пору зачетов.

* * *

Экзаменатор — дегустатор знаний.




# СТУЛ

Прыемна займацца ў чытальнай зале. Навокал калі не дактары навук, дык ва ўсякім разе студэнты першага года навучання. Гэта падбадзёрвае, надае сілы. Хочацца, нарэшце, адкрыць тайну шаравой маланкі або зрабіць нешта неверагоднае.

Сёння мне не пашанцавала: трапіўся дрэнны стул. Ён не даваў належнай устойлівасці думкам. Хістаўся, скрыпеў.

Некаторы час я успрымаў яго як непазбежнасць лёсу. Потым — раззлаваўся. І калі мая суседка выйшла з чытальнай залы, я падсунуў ёй свой стул.

Яна вярнулася і пачала перагортваць старонкі падручніка. Задумалася. Нервова захрустала пальцамі. Калі яе сусед справа накіраваўся да каталога, яна абмянялася стуламі.

Мой новы стул быў моцным і надзейным. Стаяў, як скала. Іменна на ім можна было ствараць разумнае, добрае, вечнае. Але працаваць я ўжо не мог. Я неадрыўна сачыў за тым першым стулам, які з гістарычнай няўмольнасцю мяняў уладальнікаў.

Я прыкінуў сярэднюю хуткасць яго перамяшчэння. Увёў папраўку на чытачоў, якія не ўставалі са сваіх месц. Затым пайшоў у буфет.

Калі я вярнуўся і сеў на сваё месца, стул даверліва скрыпнуў. Той самы... На гэты раз аб пакорнасці лёсу не магло быць і размовы. Як толькі мой бліжэйшы сусед неасцярожна прыўстаў, я імгненна зрабіў ракіроўку.

...Я акінуў позіркам чытальную залу. Студэнты цяжка дыхалі. Ніхто не працаваў. Кожны дзвюма рукамі трымаўся за свой стул.

В. АСІПЕНКА,
студэнт эканамічнага факультэта Гомельскага універсітэта.






# Дыялог

**Выкладчык:** Вам падабаецца гэты спецкурс?

**Студэнт:** Вельмі.

**Выкладчык:** Не, я сур'ёзна!

(З насценгазеты фізфака «За навуку»)

Малюнкі Н. ЛУГАВОЙ, А. ДАНЕКІНА і Ю. НОВІКАВА.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС: 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.